ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйнае паведамленне

ВЕРАСЕНЬ КАСТРЫЧНІК

Віцебск 2017

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Верасень–кастрычнік 2017

Інфармацыйнае паведамленне

Складальнік **Пацалуёнак** Таццяна Віктараўна

Адказны за выпуск Т. М. Адамян

Камп’ютарная вѐрстка А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а

E-mail: kray@vlib.by, vlib@vlib.by

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Верасень–кастрычнік 2017

Інфармацыйнае паведамленне

ВІЦЕБСК

2017

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнік *Т. В. Пацалуёнак*
Рэдактар *А. В. Ігнаценка*
Адказны за выпуск *Т. М. Адамян*

Культурнае жыццѐ Віцебскай вобласці : верасень-кастрычнік : інфармацыйнае паведамленне / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі ; [склад. Т. В. Пацалуѐнак]. – Віцебск, 2017. – 48 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2017

МЕРАПРЫЕМСТВЫ,

якія не ўвайшлі ў папярэдні выпуск

22–25 жніўня дэлегацыя г. Наваполацка знаходзілася з рабочым візітам у горадзе-пабраціме Адзінцова Маскоўскай вобласці, які святкаваў сваѐ 60-годдзе. У ходзе візіту была дасягнута дамоўленасць пра ўдзел прадстаўнікоў г. Адзінцова ў культурных мерапрыемствах г. Наваполацка: фестывалі “Халі-Хало”, конкурсе “Музычная лілея”, пленэры “Палітра Прыдзвіння”. Плануецца супрацоўніцтва Наваполацкай ЦБС з Дзяржаўным гісторыка-літаратурным музеем-запаведнікам імя А. С. Пушкіна. (*Новополоцк сегодня. – 2017. – 1 сент. – С. 2.*)

арганістка выканала разам з камерным аркестрам “Еўропа-Цэнтр” пад кіраўніцтвам Раіля Садыкава і салісткамі Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра Рэспублікі Беларусь Таццянай Гаўрылавай і Наталляй Акінінай.

У кастрычніку адбылося ўрачыстае асвячэнне аргана ў браслаўскім касцѐле Нараджэння Найсвяцейшай Дзевы Марыі, у якой прыняў удзел біскуп Віцебскай дыяцэзіі Алег Буткевіч. Музычны інструмент – падарунак сальватарыянскай парафіі ў Берліне. Ва ўрачыстасці ўдзельнічалі і замежныя госці, адзін з іх – ксѐндз Ёган Трумэр, прафесар Універсітэта музыкі і сцэнічных мастацтваў г. Грац (Аўстрыя), Ганаровы доктар Беларускай акадэміі музыкі. Пасля заканчэння месы ѐн даў канцэрт арганнай музыкі.

У кастрычніку вучаніца Пастаўскай дзіцячай школы мастацтваў імя А. Тызенгаўза Валерыя Патрушава прымала ўдзел у Міжнародным фестывалі-конкурсе мастацтваў “Зорная восень” у Кіеве. Юная цымбалістка заваявала Гран-пры ў намінацыі “інструментальны жанр”.

КІНАМАСТАЦТВА

14 кастрычніка ў Талачынскім Цэнтры культуры і народнай творчасці адбыўся фінал рэспубліканскага конкурсу аматарскіх турыстычных фільмаў “Путешествуем по Синеокой”. Аўтар праекта – рэжысѐр Талачынскай народнай кінастудыі “Летапіс” Дзмітрый Іўчанка.

ПРАДМОВА

«Культурнае жыццѐ Віцебскай вобласці» – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка «Хроніка падзей» уключае аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную па матэрыялах абласной газеты «Витебские вести», гарадскіх і раѐнных газет Віцебскай вобласці за перыяд з 1 верасня па 31 кастрычніка 2017 года, і ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці і цэнтральнымі бібліятэкамі вобласці.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

1–3 верасня Полацк у трэці раз прымаў Дзень беларускага пісьменства. Свята прайшло з міжнародным размахам і сабрала прадстаўнікоў звыш 20 краін свету. Маштабнасць урачыстасцяў вызначылі тры знамянальныя для беларускай гісторыі падзеі: 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, 1155-годдзе самога Полацка і непасрэдна Дзень пісьменства. У гэтыя дні ў Полацку прайшлі дзясяткі цікавых і адметных мерапрыемстваў: міжнародны "круглы стол" "Дыпламатыя слова: Францыск Скарына ў сусветнай гуманітарнай прасторы", навукова-практычная канферэнцыя "Полацкія чытанні-2017", фінал рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытальнікаў "Жывая класіка", урачыстае адкрыццё памятнага знака "Полацк – калыска беларускай дзяржаўнасці", уручэнне Нацыянальнай літаратурнай прэміі і інш.

8 верасня г. Лепель урачыста адзначыў сваю 578-ю гадавіну. Свята прайшло ярка і запамінальна. Праезд байкераў, міні-марафон "Лепельская міля-578", дэфіле духавога аркестра, паказальныя выступленні ваенных разведчыкаў Заслонаўскага гарнізона нікога з гледачоў не пакінулі раўнадушнымі. Былі разгорнуты падвор'і сельскіх Саветаў, выстава клубаў нацыянальнай кухні і аграсядзіб раёна. У гарадскім парку працавалі выстава народных рамѐстваў і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, выстава "Працоўныя будні Лепельшчыны на старых фотаздымках", былі арганізаваны свята беларускай кнігі "Да кніжных скарбаў дакраніся", творчая сустрэча "Ёсць у горадзе паэты…", пленэр мастакоў "Бульвар мастацтваў" і інш. Яркім акордам свята стала ўзнагароджанне адоранай і таленавітай моладзі, пераможцаў конкурсу па

МУЗЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ

У рамках святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання ў канцэртнай зале Полацкага Сафійскага сабора адбылося прэм'ернае выкананне салісткай канцэртнай залы Ксеніяй Пагарэлай сюіты беларускага кампазітара Ганны Кароткінай "Францыск Скарына".

9 верасня арганістка канцэртнай залы Полацкага Сафійскага сабора Ксенія Пагарэлая выступіла ў касцѐле Святых Іаанаў Вільнюскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Яна выканала сюіту "Францыск Скарына", кампазіцыі Станіслава Манюшкі і творы са знакамітага "Полацкага сшытка". Канцэрт адбыўся у рамках святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання па ініцыятыве Пасольства Рэспублікі Беларусь у Літоўскай Рэспубліцы.

15 верасня ў рамках акцыі "Музыкальные вечера "Белой Руси" на плошчы Будаўнікоў г. Наваполацка прайшоў традыцыйны канцэрт "Наваполацк – горад без наркотыкаў" з удзелам 13 лепшых рок-гуртоў краіны.

1 кастрычніка, у Міжнародны дзень музыкі, Віцебская абласная філармонія адкрыла XXIX канцэртны сезон праграмай сімфанічнага аркестра пад кіраўніцтвам Уладзіміра Бяляўскага. **19 кастрычніка** ВАФ распачала серыю канцэртаў, прымеркаваных да 10-годдзя ўсталявання ў канцэртнай установе ўнікальнага духавога аргана нямецкай фірмы Glatter-Gotz. Канцэрт-прысвячэнне віцебскаму каралю інструментаў прайшоў з удзелам тытулярнага арганіста Кафедральнага сабора Калінінграда Яўгенія Аўраменкі. Таксама ў праграме прынялі ўдзел салісты філармоніі і акадэмічны хор Віцебскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя І. І. Салярцінскага (мастацкі кіраўнік – Аляксандр Суворaў).

29 кастрычніка ў канцэртнай зале Полацкага Сафійскага сабора адбылося адкрыццё XXI Міжнароднага фестывалю арганнай музыкі "Званы Сафіі". Прагучала музыка італьянскіх кампазітараў у выкананні салісткі канцэртнай залы Ксеніі Пагарэлай. Упершыню ў Полацку прагучаў вядомы твор кампазітара Джавані Пергалезі "Stabat Mater", які

Кокштыс. У спектаклі заняты Наталля Аладка, Аляксандр Базук, Дзмітрый Каваленка і інш.

24 верасня заслужаная артыстка Беларусі Таццяна Ліхачова выйшла на коласаўскую сцэну ў сваім бенефісным спектаклі “Дзіўная місіс Сэвідж”. 27 верасня адбыўся бенефіс вядучага майстра сцэны тэатра імя Я. Коласа Юрася Цвіркі з нагоды яго 50-гадовага юбілею.

11 кастрычніка коласаўцы прымалі ўдзел у XXXIII Міжнародным тэатральным фестывалі “Ліпецкія тэатральныя сустрэчы” і на вялікай сцэне Ліпецкага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра драмы імя Л. Талстога паказвалі эцюды памяці “Шагал… Шагал…” па п’есе У. Драздова. Па выніках фестывалю тэатр і спектакль узнагароджаны Спецыяльным дыпломам аргкамітэта “За прикосновение к сокровенному”.

25–27 кастрычніка тэатр імя Я. Коласа павѐз у Брэст спектаклі “Доктар філасофіі”, “Шукаем тэнара!”, “Дзіўная місіс Сэвідж”. У гэты час трупа Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы паказала віцебскаму гледачу 3 спектаклі на рускай мове: «Коварство и любовь», «Старший сын», «Веселый вдовец».

24 верасня спектаклямі “Вясѐлы Дарафей” і “Дэкамерон” Беларускі тэатр “Лялька” распачаў 32-гі тэатральны сезон. У гэты дзень сталі вядомыя лепшыя артысты папярэдняга тэатральнага сезона. У намінацыі “Лепшая мужчынская роля” перамог Яўген Гусеў, у намінацыі “Лепшая жаночая роля” – Вольга Лазебная. У намінацыі “Лепшая эпізадычная роля” вызначыўся Сяргей Талкач. У канцы верасня гледачы ўбачылі спектакль “Фенька” Леаніда Панцялеева ў пастаноўцы Міхася Клімчука. У спектаклі заняты Яўген Гусеў, Марыя Кавалѐва, Сяргей Талкач і Аксана Нікеенка. Калектыў тэатра быў адзначаны дыпломам I Кіеўскага міжнароднага фестывалю тэатраў лялек “PUPPET. UP” за раскрыццѐ прыгажосці ўсходняй культуры ў спектаклі “Чароўная зброя Кэндзо”.

добраўпарадкаванні, а таксама конкурсу падвор’яў сельсаветаў. Выдатны настрой падарылі гасцям канцэртная праграма “З днѐм нараджэння, любімы горад!” і харэаграфічны фестываль “Лепельскі карагод”.

9 верасня 513-ы дзень нараджэння роднага горада адзначылі жыхары Чашнікаў. Пачалося свята з шэсця калоны з удзелам ветэранаў, прадстаўнікоў працоўных калектываў і грамадскасці. Былі ўручаны ганаровыя граматы райвыканкама і іншыя ўзнагароды лепшым працаўнікам, пераможцам раѐннай спартакіяды, адкрытага конкурсу юных выканаўцаў эстраднай песні “Зажигаем звезды”, лідэрам лепшых пярвічных прафсаюзных арганізацый. Многа прыемных хвілін прынеслі выступленні выканаўцаў і творчых калектываў Чашніцкага ГДК, Новалукомльскага ДК, Чашніцкага РЦДіМ, духавога аркестра ваеннаслужачых, творчага калектыву “Землякі” Лукомльскай ДРЭС. Музейныя работнікі запрасілі на імправізаваную “Краязнаўчую пляцоўку” і ў рэтрагалерэю, народныя ўмельцы – у “Горад майстроў”, сельскія Саветы – на вясѐлы кірмаш, установы адукацыі і культуры – на багатыя панадворкі. Бібліятэкары правялі акцыю “Запішыся ў бібліятэку”. Былі адчынены “Салон Златовласки”, “Хлебная лаўка”. Была праведзена дабрачынная акцыя “От сердца к сердцу”, прайшлі спаборніцтвы “Автоледи-2017”. Святочную праграму завяршылі вячэрняя дыскатэка і феерверк.

16 верасня свой 453-і дзень нараджэння адзначыў гарпасѐлак Сураж Віцебскага раѐна. На свяце былі падведзены вынікі конкурсу на лепшае добраўпарадкаванне падвор’яў. Пераможцы атрымалі ўзнагароды і падарункі – нумары мастацкай самадзейнасці. Святочны настрой стваралі культработнікі: песні гучалі да самага вечара.

23 верасня ў г. п. Расоны быў праведзены Дзень памяці, прысвечаны 75-й гадавіне вызвалення райцэнтра ад нямецка-фашысцкай акупацыі. Работнікі раѐннага Цэнтра культуры і народнай творчасці падрыхтавалі тэматычную праграму “На войне как на войне…”. Удзельнікі Віцебскага абласнога грамадскага аб’яднання ваенна-

гістарычнай рэканструкцыі “Товарищи по оружию” ўзнавілі падзеі таго часу.

30 верасня ў Дуброўне адбыўся абласны фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі “Дажынкі-2017”. Свята прайшло ў найлепшых традыцыях, парадавала цікавымі адметнасцямі: феерычным авіяшоу, выставамі, тэатралізаванымі пастаноўкамі, прэзентацыямі. Цэнтральным дзействам стала ўшанаванне лепшых хлебаробаў вобласці. Адным з ключавых стаў праект “Віцебшчына фестывальная”: кожны раён Прыдзвінскага краю аформіў свой падворак і там сустракаў гасцей. Вялікую цікавасць вызвалі конкурс “Дажыначны сноп”, выстава караваяў раёнаў, майстар-класы народных майстроў, праект “Традыцыйны касцюм Віцебшчыны”, спаборніцтвы “Асілак сяла” і інш. Незыбыўныя ўражанні пакінулі выступленні творчых калектываў вобласці.

6 кастрычніка ў Палацы Рэспублікі адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання лепшых прадстаўнікоў сферы культуры Беларусі, у тым ліку Віцебскай вобласці. Дырэктар Лепельскай ДШМ **Вераніка Хомбак** удастоена Ганаровай граматы Савета Міністраў. Падзякі прэм’ер-міністра былі ўручаны намесніку генеральнага дырэктара па канцэртнай дзейнасці Цэнтра культуры “Віцебск” **Леаніду Багараду** і першаму намесніку генеральнага дырэктара Цэнтра культуры “Віцебск” **Алене Серабраковай**. Ганаровай граматай Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь узнагароджана начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Полацкага райвыканкама **Алена Астапава**, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь – галоўны спецыяліст аддзела культуры галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама **Станіслаў Генеральніцкі**. Былі адзначаны і іншыя работнікі культуры Віцебшчыны. (*Витьбичи. – 2017. – 10 окт. – С. 1.*)

10 кастрычніка ў Віцебскай абласной бібліятэцы імя У. І. Леніна былі праведзены ўрачыстасці з нагоды Дня работнікаў культуры. Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў У. У. Цярэнцьеў

Дом рамѐстваў прадставіў на выставе сваю рэгіянальную ўнікальнасць. (*Витебские вести. – 2017. – 9 сент. – С. 16.*)

11 кастрычніка сваю творчасць на выставе ў АМЦНТ прадставілі ўдельнікі народнага клуба народных майстроў “Майстар” Чашніцкага Дома рамѐстваў і народнага клуба народных майстроў і мастакоў-аматараў Талачынскага Дома рамѐстваў.

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

3 верасня на абноўленай сцэне Полацкага гарадскога Палаца культуры адбыўся прэм’ерны паказ спектакля Веры Кісялѐвай “Легенда пра Усяслава Полацкага” ў пастаноўцы Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь тэатра “Пілігрым”. Гэта падарунак творчага калектыву да 1155-годдзя Полацка.

Верасень для Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа быў насычаны падзеямі. 7 і 8 верасня віцебскі глядач убачыў спектаклі па п’есах італьянскіх драматургаў у пастаноўцы Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага – “Viva Commedia!” Р. Піпа і “Карчмарка” К. Гальдоні. 9 верасня свой 92-гі сезон коласаўскі тэатр традыцыйна адкрыў камедыяй “Несцерка” – спектаклем, якому сѐлета споўнілася 75 год. 13 верасня адбыўся агульны сход супрацоўнікаў творчага калектыву, на якім прысутнічаў міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс Святлоў. Калектыву быў прадстаўлены новы мастацкі кіраўнік тэатра. На гэту пасаду назначаны рэжысѐр-пастаноўшчык **Міхась Дзмітрыевіч Краснабаеў**. Нагрудны знак Міністэрства культуры “За ўклад у развіццѐ культуры Беларусі” быў уручаны заслужанай артыстцы Беларусі **Таццяне Ліхачовай**. Шэраг коласаўцаў быў адзначаны Ганаровымі граматамі Міністэрства культуры і падзякамі міністра культуры. 22 верасня адбылася прэм’ера спектакля “Самая жаданая” (камедыя сучаснага беларускага аўтара Сяргея Гіргеля па матывах французскай драматургіі). Рэжысѐр-пастаноўшчык і стваральнік музычнага афармлення – Ніна Обухава. У галоўнай ролі – Тадэвуш

персанальная выстава “Ветер перемен” аршанскай мастачкі, выкладчыка ДШМ № 1 г. Оршы, члена народнага клуба народных майстроў Аршанскага Дома рамѐстваў Іны Ганчаровай (жывапіс па скуры).

13 кастрычніка ў Браслаўскім музеі традыцыйнай культуры адкрылася выстава жывапісу браслаўскага мастака Яна Рыдзікі. Экспазіцыя пад назвай “Шляхамі Скарыны” прысвечана выдатным асобам Беларусі.

ФОТАМАСТАЦТВА

У Аршанскай гарадской мастацкай галерэі В. А. Грамыкі **ў верасні** адкрылася першая персанальная выстава маладога аршанскага фатографа Аляксандра Каліноўскага. У экспазіцыі пад назвай “Сквозь Тени и Свет” прадстаўлены 37 фотаработ.

“Мы из Беларуси” – пад такой назвай у **верасні-кастрычніку** экспанавалася фотавыстава ў Культурна-гістарычным комплексе «Залатое кольца горада Віцебска «Дзвіна». Сярод арганізатараў выставы – наш зямляк Барыс Беленькі, заснавальнік фотаклуба “Цафон” у Хайфе (Ізраіль). У экспазіцыі прадстаўлены работы 60 аўтараў.

У кастрычніку ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі экспанавалася персанальная выстава фотакарэспандэнта газеты “Витебские вести” Дзмітрыя Осіпава. У экспазіцыі пад назвай “Мечты о небе…” прадстаўлена 45 маляўнічых фатаграфій.

ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

У Віцебскім АМЦНТ **7 верасня** адкрылася выстава творчасці народных клубаў народных майстроў і самадзейных мастакоў Сенненскага і Шумілінскага Дамоў рамѐстваў. Гэтыя ўстановы культуры маюць багатыя традыцыі і свае адметныя асаблівасці. Шуміліншчына цікавая перш за ўсѐ ткацтвам, ганчарствам, батлейкай, а таксама старэйшым клубам нацыянальнай кухні. Сенненцы адрадзілі каля паўсотні беларускіх касцюмаў, ажыццявілі выраб незвычайнай свістулькі. Кожны

уручыў прэміі аблвыканкама за высокія творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва ў васьмі намінацыях. Гэтай узнагароды ўдастоены вакалістка Віцебскай абласной філармоніі **Алена Папко**, артыст Беларускага тэатра “Лялька” **Яўген Гусеў**. Лепшым музейным работнікам прызнана загадчык навукова-асветнага аддзела Віцебскага абласнога краязнаўчага музея **Алена Зорына**, лепшым бібліятэчным работнікам – загадчык аддзела бібліятэказнаўства Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна **Наталля Пугачова**. Прэмія ў намінацыі “Лепшы клубны работнік” уручана загадчыку аддзела культурна-масавай работы Цэнтра культуры “Віцебск” **Веры Чашчыхінай**, у намінацыі “За педагагічныя дасягненні” – настаўніку Наваполацкай дзіцячай мастацкай школы імя І. Хруцкага **Іне Шыпіла**. Лаўрэатам прэміі стала таксама майстар Шумілінскага раѐннага Дома рамѐстваў **Наталля Сцержанкова**. У намінацыі “Лепшы арганізатар платных паслуг насельніцтву” ўзнагароджана дырэктар Аршанскай ЦБС **Святлана Жвікава.** Шэраг работнікаў культуры быў адзначаны ганаровымі граматамі аблвыканкама, аблсавета, міністэрстваў культуры і асветы, падзякамі старшыні аблвыканкама. На святочнай вечарыне адбылося ўзнагароджанне па выніках абласнога конкурсу тэматычных пляцовак брэндаў раѐнаў і гарадоў, праведзенага ў рамках фестывалю “Славянскі базар у Віцебску-2017”. На фоне адкрытай у бібліятэцы выставы снапоў і караваяў былі падведзены вынікі абласных конкурсаў “Дажыначны сноп” і “Каравай Віцебшчыны”, якія праходзілі на абласным фестывалі-кірмашы працаўнікоў сяла “Дажынкі” ў Дуброўне. Творчым падарункам удзельнікам імпрэзы стала выступленне калектываў мастацкай самадзейнасці Гарадоцкага раѐна.

Святочныя мерапрыемствы ў сувязі з прафесійным святам – Днѐм работнікаў культуры – прайшлі ва ўсіх гарадах і раѐнах Віцебшчыны. Шмат слоў удзячнасці за шчырую, добрасумленную працу прагучала ў адрас прадстаўнікоў гэтай прафесіі, работа многіх была адзначана важкімі ўзнагародамі. У незвычайным фармаце прайшло свята ў Лѐзненскім раѐнным Цэнтры культуры, дзе быў арганізаваны Парад творчасці з

удзелам лепшых работнікаў галіны, ветэранаў культуры, гасцей з Веліжскага раёна Смаленскай вобласці. Да работнікаў культуры Браслаўшчыны з прыгожым музычным падарункам завіталі іх калегі з Глыбокага. Мерапрыемства пад назвай “Стваральная энергія творчых душ” работнікі культуры Лепельшчыны правялі ў глядзельнай зале ваеннага санаторыя. Традыцыйная цырымонія ўручэння прэміі года “Іскра” лепшым работнікам культуры Докшыцкага раёна прайшла ў райцэнтры. Падарункам для работнікаў культуры Верхнядзвіншчыны ад раённай прафсаюзнай арганізацыі стала паездка ў агратурыстычны комплекс “Наносы –Наваселле” на беразе возера Нарач.

10 кастрычніка ў г. п. Лёзна адбыліся святочныя мерапрыемствы, прысвечаныя 74-й гадавіне вызвалення Лёзненскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У праграме: ускладанне кветак на воінскім пахаванні, літаратурна-музычная кампазіцыя “Голас Радзімы”, знаёмства з экспазіцыяй перасоўнай выставы сацыяльна-патрыятычнага фотапраекта “Глаза Победы”, канцэртная праграма з удзелам мясцовых творчых калектываў і ансамбля лірычнай песні “Луховичанка” (Маскоўская вобласць).

КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ

6 верасня ў Віцебскім гарвыканкаме адбылася дзелавая сустрэча прадстаўнікоў улады, бізнесу, навукі, культуры, турызму і спорту Віцебска з дэлегацыяй польскага Любліна. У ходзе сустрэчы быў адзначаны вялікі патэнцыял у сферы дзейнасці двух гарадоў, у тым ліку і ў культурным жыцці.

Пагадненне аб супрацоўніцтве органаў мясцовага самакіравання падпісалі старшыні Віцебскага гарадскога Савета дэпутатаў Уладзімір Бялевіч і Думы Белаярскага раёна Ханты-Мансійскай аўтаномнай акругі – Югра Сяргей Булычоў у час знаходжання віцебскай дэлегацыі на Дні Белаярскага раёна. Абодва бакі выразілі ўпэўненасць у тым, што эканамічныя і культурныя сувязі гарадоў-пабрацімаў будуць мацнець і

Алены Івановіч “Пейзаж як стан душы”. Аўтар – мастак-афарміцель аддзела бібліятэчнага маркетынгу ЦБС, член народнага клуба народных майстроў і самадзейных мастакоў “Докша”.

З **20 па 30 верасня** Аршаншчына прымала ўдзельнікаў рэспубліканскага пленэру жывапісу “Сівая легенда”. 9 майстроў з Віцебска, Мінска і Барані праехалі праз увесь раён, каб напісаць сваё прысвячэнне Оршы з нагоды яе 950-годдзя.

У Глыбоцкім Цэнтры традыцыйнай культуры і народнай творчасці **ў верасні** адкрылася выстава мастацкіх твораў глыбачанкі Галіны Машковай, удзельніцы клуба народных майстроў “Крыніца”. У экспазіцыі пад назвай “Асенні сон” размешчаны гравюры і жывапісныя палотны маладога аўтара.

Персанальная выстава твораў віцебскага мастака-акварэліста Фелікса Гумена “Прогулки по Витебску” адкрылася **ў верасні** ў Гарадоцкім краязнаўчым музеі.

Член Саюза мастакоў Беларусі Георгій Танковіч адкрыў **у верасні** выставу жывапісных твораў у Наваполацкай ДШМ імя І. Ф. Хруцкага.

“Польский сонник” – пад такой назвай адкрыў **у кастрычніку** сваю выставу польскі мастак Рышард Кая. Экспазіцыя ў Арт-цэнтры Марка Шагала ўключыла яго тэатральныя творы – сцэнаграфію і афішы, але галоўную частку занялі плакаты, прысвечаныя гарадам Польшчы.

У кастрычніку ў Мієрскім гісторыка-этнаграфічным музеі адкрылася выстава работ мастака Вячаслава Шамшура. Наведвальнікі ўбачылі 26 карцін у тэхніцы пастэль і масляны жывапіс. Работы напісаны ў розныя перыяды творчасці, амаль на ўсіх адлюстраваны мієрскія краявіды.

У Аршанскай мастацкай галерэі “Каляровы шлях” **у кастрычніку** адкрылася выстава “Поэзия цвета” віцебскага мастака Алега Скавародкі. У экспазіцыі жывапісныя нацюрморты, пейзажы, партрэты, сюжэтныя кампазіцыі.

6 кастрычніка ў Аршанскім музеі У. С. Караткевіча адкрылася

мастацкая школа імя І. Ф. Хруцкага г. Наваполацка. Напярэдадні юбілею былі адкрыты 2 выставы. Экспазіцыя “Нити творчества” размясцілася ў фае навуковай бібліятэкі Полацкага дзяржуніверсітэта. Выстава “ART Start” была прадстаўлена ў выставачнай зале музея гісторыі і культуры горада Наваполацка.

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

У рамках святкавання 1155-годдзя Полацка адбылася прэзентацыя вынікаў мастацкага пленэру, які праходзіў у Кіеве, Вялікім Ноўгарадзе і Полацку. Культурна-мастацкі праект “Тры Сафіі: Сафія Кіеўская, Сафія Наўгародская, Сафія Полацкая” сабраў у канцэртнай зале Сафійскага сабора аматараў жывапісу, якія ўбачылі плѐн працы майстроў пэндзлю – выявы трох сусветна вядомых жамчужын архітэктуры. У мерапрыемстве прынялі ўдзел міністр культуры Беларусі Барыс Святлоў і спецыяльны прадстаўнік прэзідэнта Расійскай Федэрацыі па міжнародным культурным супрацоўніцтве Міхаіл Швыдкой.

8 верасня ў мастацкім салоне “Скарбонка” г. Лепеля адкрылася персанальная выстава твораў вядомага беларускага жывапісца, ураджэнца Лепельшчыны Алега Скавародкі. Арганізатары – Беларускі саюз мастакоў, раѐнны краязнаўчы музей і Цэнтр рамѐстваў.

У Аршанскай гарадской мастацкай галерэі В. А. Грамыкі **ў кастрычніку** была прэзентавана выстава жывапісу “На просторах Родины” мастака Мікалая Рыжова з г. Горкі.

З **15 верасня па 8 кастрычніка** ў Культурна-гістарычным комплексе «Залатое кольца горада Віцебска «Дзвіна» праходзіла выстава, прысвечаная 70-гадоваму юбілею народнага клуба самадзейных мастакоў “Контур”. У экспазіцыі былі прадстаўлены работы мастакоў, якія ўжо пайшлі з жыцця, і творы 31 удзельніка клуба. Гэта жывапіс, разьба па дрэве, габелен, кераміка.

У выставачнай зале Докшыцкага Дома рамѐстваў **у верасні–кастрычніку** экспанавалася персанальная выстава маладой мастачкі

далей. (*Витьбичи. – 2017. – 14 сент. – С. 2.*)

У верасні на Лепельшчыну завіталі ўдзельнікі Трэцяга фестывалю мастацтваў беларусаў свету – дэлегацыі з г. Санкт-Пецярбурга (музычны калектыў “Рэтра-Хіт” Беларускай нацыянальнай культурнай аўтаноміі), г. Цюмені (вакальны фальклорны ансамбль “Вячоркі” Цюменскай абласной грамадскай арганізацыі “Нацыянальна-культурнае таварыства “Аўтаномія Беларусь”), літоўскага горада Вісагінас (ансамбль “Світанак” Беларускага культурнага цэнтра “Крок”). Для гасцей былі арганізаваны экскурсіі ў раѐнны краязнаўчы музей, мастацкі салон “Скарбонка”, канцэрт у дзіцячай школе мастацтваў. Беларусаў замежжа прымалі таксама і ў Докшыцкім раѐне. Госці з г. Вісагінаса і в. Вікулава Цюменскай вобласці наведалі мемарыяльны комплекс “Праклѐн фашызму”, дзе іх да слѐз кранула тэатралізацыя таго жудаснага дня, калі фашыстамі была спалена вѐска Шунеўка. У кіна-канцэртнай зале “Іскра” райцэнтра адбыўся сумесны канцэрт з творчымі калектывамі Докшыччыны.

22 верасня ў Віцебскім гарвыканкаме быў падпісаны Пратакол рэалізацыі пагаднення аб развіцці пабрацімскага супрацоўніцтва паміж Віцебскам і кітайскім горадам Цзінань на 2017–2020 гады. Дакумент прадугледжвае развіццѐ сувязяў у розных сферах, у тым ліку ў культуры.

Народны ансамбль народнай песні “Відзаўчанка” Відзаўскага ДК Браслаўскага раѐна прадстаўляў Беларусь на Міжнародным фестывалі народнай музыкі і танца, які праходзіў у трох гарадах Літвы – Ігналіне, Малетаі і Пабрадзе. (*Браслаўская звязда. – 2017. – 27 верас. – С. 6.*)

У канцы верасня па запрашэнні адміністрацыі расійскага рэгіѐна дэлегацыя Шумілінскага раѐна пабывала ў Вялікіх Луках на святкаванні 90-годдзя з дня ўтварэння Велікалуцкага раѐна Пскоўскай вобласці. Цѐпла сустракалі расійскія гледачы народны фальклорны калектыў “Гульбічы” Шумілінскага раѐннага Цэнтра культуры, які выступіў з вялікай канцэртнай праграмай. У ходзе візіту былі дасягнуты дамоўленасці аб пашырэнні стасункаў у культуры.

Напрыканцы верасня Верхнядзвінскі раён наведала дэлегацыя з расійскага горада-пабраціма Кінгісепа. Мэта візіту – умацаванне міжрэгіянальных сувязяў, развіццё супрацоўніцтва ў эканамічнай і сацыяльна-культурнай сферах. Госці наведалі раённы краязнаўчы музей, дзе пазнаёміліся з гісторыяй краю і рэдкімі экспанатамі.

5 кастрычніка войты гмін Падляшскага ваяводства на чале з саветнікам Пасольства Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь Аркадзіушам Сарнам наведалі Міёрскі раён з мэтай арганізаваць сумесныя праекты ў эканамічнай і культурнай сферах. Польская дэлегацыя зацікавілася прапановамі па адраджэнні народных традыцый у Перабродзі, гісторыя якога звязана з польскім каралём Жыгімонтам Аўгустам і дзе летам на аграсядзібе "Мацейкава сяліба" праходзяць летнікі рамеснікаў, на якіх майстры асвойваюць тэхніку валяння з воўны. Яшчэ адзін прыярытэтны накірунак сумеснага развіцця – верхавое балота "Ельня".

10 кастрычніка было падпісана пагадненне аб дружбе, добрасуседстве і супрацоўніцтве паміж Лёзненскім раёнам і гарадской акругай Лухавіцы Маскоўскай вобласці. Дакумент прадугледжвае кантакты і абмен вопытам у розных сферах, у тым ліку ў культуры. Расійскія госці прынялі ўдзел у святкаванні Дня вызвалення Лёзненшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, наведалі аграгарадок Дабрамыслі, культурна-аздараўленчы цэнтр і ваенна-гістарычны музей у г. п. Лёзна.

У кастрычніку Браслаўшчыну наведала з візітам дэлегацыя Ігналінскага самакіравання на чале з віцэ-мэрам Лаймуцісам Рагайцісам. Літоўскія госці наведалі шэраг вытворчых, прыродных і культурных аб'ектаў раёна. Яны высока ацанілі работу ўстаноў культуры па захаванні народных традыцый.

Народны фальклорны ансамбль Езярышчанскага гарпасялковага Дома культуры "Азерыца" прыняў удзел у Міжнародным фальклорным фестывалі "Золотые родники", які праходзіў **13–14 кастрычніка** ў

МАСТАЦТВА

Віцебскі ансамбль танца, музыкі і песні "Талака" Віцебскай абласной філармоніі **ў верасні** гастраляваў па Іспаніі. Канцэрты праходзілі ў залах і на адкрытых пляцоўках, у вялікіх і малых гарадах, на фестывалях і святах. У гастрольным турнэ быў прадстаўлены ўвесь калектыў: вакальная, танцавальная групы і аркестр.

10 кастрычніка Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка падпісаў Указ аб ушанаванні прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці дзяржаўнымі ўзнагародамі. Сярод іх – настаўнік харавых дысцыплін, хормайстар узорнага хору ДУК "Дзіцячая школа мастацтваў № 1 г. Віцебска" **Віталій Рауза**, які адзначаны медалём Францыска Скарыны.

19–22 кастрычніка ў канцэртнай зале "Віцебск" прайшоў XXXI адкрыты фестываль аўтарскай песні, паэзіі і візуальных мастацтваў "Віцебскі лістапад-2017". Сёлетні фестываль сабраў звыш сотні ўдзельнікаў з 8 краін. У намінацыі "Аўтарская песня. Класіка (выканаўца)" дыплом I ступені атрымала віцебскае трыа ў складзе Ірыны Макарчык, Андрэя Касалапава і Цімафея Чысцякова. Яны сталі таксама ўладальнікамі галоўнага прыза – спецыяльнай узгнагароды "Прызнанне".

Напрыканцы кастрычніка ў г. п. Бешанковічы адзначылі 125-годдзе з дня нараджэння вядомага земляка Саламона Юдовіна – таленавітага мастака і этнографа, даследчыка яўрэйскага народнага мастацтва. На семінары ў раённай бібліятэцы мясцовыя краязнаўцы і даследчыкі з Віцебска, Санкт-Пецярбурга расказалі пра біяграфію, дзейнасць і спадчыну майстра. Вялася размова пра стварэнне музея слыннага земляка на яго радзіме. Удзельнікі пазнаёміліся з экспазіцыяй работ С. Юдовіна ў бібліятэцы і экспазіцыяй у раённым гісторыка-краязнаўчым музеі, якая была прысвечана гісторыі і быту мястэчка Бешанковічы да сярэдзіны XX стагоддзя. У Бешанковіцкай дзіцячай школе мастацтваў адбыўся святочны канцэрт. (*Зара. – 2017. – 10 лістап. – С. 4.*)

40-годдзе з дня заснавання адзначыла **ў кастрычніку** дзіцячая

Сяргеем Трафімавымі.

У Музеі гісторыі і культуры Наваполацка быў дадзены старт новаму сацыяльна-культурнаму праекту пад назвай “Горад, у якім я жыву”. Ён уключае серыю інтэлектуальна-пазнавальных гульняў краязнаўчай накіраванасці. У адборачным этапе прынялі ўдзел старшакласнікі – члены БРСМ.

У полацкім Музеі беларускага кнігадрукавання **ў кастрычніку** адкрылася выстава работ Ёгана Крыстафа Бротцэ з калекцыі Акадэмічнай бібліятэкі Латвійскага ўніверсітэта. У экспазіцыі прадстаўлены ўнікальныя малюнкі і апісанні Ліфляндыі, зробленыя аўтарам у канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзяў. У адкрыцці прынялі ўдзел консул Латвійскай Рэспублікі ў Віцебску Угіс Скуя і дырэктар Акадэмічнай бібліятэкі Латвійскага ўніверсітэта Вента Коцарэ.

У рамках ініцыятывы “Стварэнне віртуальных падарожжаў па гісторыка-культурнай спадчыне рэгіёна” Глыбоцкі гісторыка-этнаграфічны музей правёў конкурс дзіцячых малюнкаў і напрыканцы **кастрычніка** адкрыў выставу “Мой край – ты прекрасен”.

30 кастрычніка ў зале стацыянарнай выставы “Комсомол в моем сердце” музея гісторыі і культуры Наваполацка была праведзена сустрэча лідэраў наваполацкага камсамольскага руху мінулых гадоў з прадстаўнікамі гарадской арганізацыі ГА “БРСМ”.

Напрыканцы кастрычніка ў Аршанскім музеі У. С. Караткевіча адбылося пасяджэнне літаратурна-музычнай гасцёўні з удзелам гасцей з Расіі – паэта-песенніка, барда, члена Саюза пісьменнікаў Расіі Сяргея Лявонцьева і маладой паэткі Аліны Сярогінай. Яны прапанавалі ўвазе прысутных новую літаратурна-музычную праграму “Сонечны востраў”.

У Лепельскім раённым краязнаўчым музеі быў праведзены “круглы стол” на тэму “Асаблівасці вясельнага абраду на Лепельшчыне”. Правяла мерапрыемства дырэктар музея Аліна Стэльмах, а яго ўдзельнікамі сталі работнікі раённага Цэнтра рамёстваў, сельскіх Дамоў культуры і клубаў.

г. Пскове. Удзельнікі ансамбля акрамя народных песень выконвалі народныя інструментальныя творы і былі адзначаны дыпломамі фестывалю.

Дэлегацыя Лёзненскага раёна прыняла ўдзел ў Днях беларускай культуры ў латвійскім горадзе Елгава, якія прайшлі **з 16 па 22 кастрычніка**. Арганізатарам выступіла Елгаўскае беларускае таварыства “Лянок”. Лёзненшчыну прадстаўлялі народны фальклорны калектыў “Медуніца” Дома культуры аграгарадка Адаменкі, майстры раённага Дома рамёстваў, работнікі культуры. Самадзейныя артысты з абодвух бакоў паказалі сумесны канцэрт у мясцовым Доме культуры, а лёзненцы выступілі яшчэ з дабрачыннай праграмай у інтэрнаце для пажылых людзей. Былі арганізаваны выстава-продаж сувеніраў Лёзненскага Дома рамёстваў і майстар-класы лёзненскіх умельцаў для школьнікаў. Гаспадары правялі для беларусаў майстар-клас па вырабе карамелі. (*Сцяг перамогі. – 2017. – 27 кастр. – С. 2–3.*)

У Днях беларускай культуры, якія прайшлі **ў кастрычніку** ў Даўгаўпілсе і былі ініцыяваны Саюзам беларусаў Латвіі, прыняў удзел народны тэатр Браслаўскага РЦК. Сёлетнія мерапрыемствы былі прысвечаны 135-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа. З гэтай нагоды калектыў пад кіраўніцтвам Яўгена Набеева папоўніў свой рэпертуар знакамітай “Паўлінкай” і паказаў п’есу двойчы – у Даўгаўпілсе і ў Краславе.

Дэлегацыя Віцебскага раёна прыняла ўдзел у культурна-эканамічным форуме “Ивановский район: традиции, инновации, перспективы”. Гэта стала чарговым крокам на шляху да супрацоўніцтва з расійскім рэгіёнам не толькі ў эканамічнай, але і ў гуманітарна-культурнай сферы. Беларусы наведалі адкрыты фестываль “Ивановский капустник”, Дом-музей сям’і Цвятаевых і іншыя аб’екты культурнай спадчыны.

Народны тэатр лялек “Капялюш” Наваполацкага Цэнтра рамёстваў і традыцыйнай культуры прыняў удзел у фестывалі-конкурсе сямейных і самадзейных лялечных тэатраў “КуклоГрад-2017” у расійскім

горадзе Вялікія Лукі. Спектаклі навапалачан былі адзначаны адразу двума дыпломамі ў катэгорыі “Лялечная пастаноўка” – “За цікавую неардынарную падачу” і “Лепшае мастацкае афармленне”. Спецыяльным дыпломам ад спонсараў фестывалю быў узнагароджаны кіраўнік калектыву Андрэй Рэцікаў.

Напрыканцы **кастрычніка** стартавалі Дні культуры Латвіі ў Віцебску, якія кіраўнік консульства Латвійскай Рэспублікі ў Віцебску Угіс Скуя назваў “віцебскім эксклюзівам”. Яны насычаны рознымі мастацкімі праектамі. У Мастацкім музеі адкрыліся цікавыя экспазіцыі: работы навучэнцаў знакамітай мастацкай школы імя Яна Разэнталя (г. Рыга), жывапісныя індустрыяльныя пейзажы выкладчыка Латвійскай акадэміі мастацтваў Андрыса Віталіньша, персанальная выстава тэкстыльных аб’ектаў і скульптуры маладой мастачкі з Рыгі Дзіяны Янушоне.

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

2 верасня жыхары вѐсак Залессе і Емяльянава Лѐзненскага раѐна святкавалі Дзень вѐскі. Мерапрыемства пад назвай “Живая история села” было арганізавана Емяльянаўскім клубам-бібліятэкай. Адбылося адкрыццѐ і асвячэнне адноўленай крыніцы, з канцэртнымі нумарамі выступілі мясцовыя самадзейныя артысты і госці з райцэнтра, свае вершы чытала лѐзненская паэтэса Я. Саламаціна. У гэты ж дзень аналагічнае свята адзначалі жыхары аграгарадка Адаменкі. Адбылося ўшанаванне лепшых працаўнікоў, старэйшых жыхароў, юбіляраў, творчых людзей. Праводзіліся конкурсы, свае музычныя віншаванні дарылі самадзейныя артысты з Лѐзна і ДК аг. Адаменкі. Сюрпрызам для жыхароў аграгарадка стала тэатралізаванае прадстаўленне, у якім самадзейныя акцѐры расказалі пра тое, як гвардыі палкоўнік і ўладальнік мястэчка Адаменкі Аляксандр Шыбека ў пачатку XX стагоддзя прайграў радавы маѐнтак двараніну Мікалаю Хлюсціну.

8 верасня ў Верхнядзвінскім РДК прайшоў літаратурна-музычны

прыняў удзел Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Румыніі ў Рэспубліцы Беларусь В. Машану. (*Витебские вести. – 2017. – 23 сент. – С. 16.*)

5 кастрычніка адбылося арганізацыйнае пасяджэнне грамадскага клуба “Жывая гісторыя”, створанага пры Пастаўскім раѐнным краязнаўчым музеі. Заснавальнікі – калектыў музея і раѐнны савет ветэранаў.

6 кастрычніка ў Браславе адбылася Міжнародная навуковая канферэнцыя “Мікрагісторыя і гісторыя штодзѐннасці: новы погляд на гістарычную і культурную спадчыну” ў рамках Тыдняў устойлівага развіцця-2017 пры садзейнічанні Праграмы падтрымкі Беларусі Федэральнага ўрада Германіі. Супрацоўнікі Браслаўскага раѐннага аб’яднання музеяў атрымалі арганізацыйна-метадычную і фінансавую падтрымку. У канферэнцыі прынялі ўдзел гісторыкі як з Беларусі (Мінск, Віцебск, Полацк, Мѐры), так і даследчыкі гістарычнага мінулага з Польшчы, Расіі, Латвіі і Украіны. Завочна ўдзельнічалі вучоныя з Казахстана і Турцыі. Для ўдзельнікаў навуковага мерапрыемства было арганізавана знаѐмства з горадам і музеямі Браслава.

Супрацоўнікі Полацкага музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер’я сумесна з фальклорным гуртом “Варган” правялі старажытны абрад ушанавання ўраджаю “Багач”.

У кастрычніку Віцебскі і Брэсцкі абласныя краязнаўчыя музеі правялі абменныя выставы твораў мастацтва. У Брэсце экспанавалася выстава “Жывапіс Ю. М. Пэна”, у Віцебску – “Еўрапейская рэпрадукцыйная гравюра XIX стагоддзя”.

Напярэдадні Дня работнікаў культуры ў Аршанскім музеі У. С. Караткевіча адкрылася выстава “Родным з любоўю”. У экспазіцыі – вышытыя карціны і вязаныя рэчы, створаныя былым дырэктарам Аршанскага ГДК і Аршанскага гарадскога парку культуры і адпачынку, заслужаным работнікам культуры Расійскай Федэрацыі Валянцінай Пятровай-Мачульскай. “Аршанскі буквар учора і сѐння” – пад такой назвай у музеі прайшла сустрэча з дзіцячымі пісьменнікамі Галінай і

2 верасня, у дзень святкавання 1155-годдзя старажытнага Полацка, побач з велічным Сафійскім саборам быў урачыста адкрыты памятны знак “Полацк – калыска беларускай дзяржаўнасці”. Аўтары праекта – скульптар Уладзімір Піпін і архітэктар Армэн Сардараў.

«От “катеринки” до белорусского рубля» – пад такой назвай у галерэі Аршанскага музея У. С. Караткевіча на працягу **верасня** экспанавалася выстава грашовых знакаў з прыватных калекцый аршанцаў Віталя Маторава і Ірыны Базылевай.

У Оршы прэзентавалі пешаходны экскурсійны маршрут “Белорусский Суздаль”, куды ўвайшлі 10 аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны. (*Витебские вести. – 2017. – 12 сент. – С. 7.*)

У музеі гісторыі і культуры Наваполацка адкрылася выстава студэнтаў-архітэктараў Полацкага дзяржуніверсітэта, прысвечаная 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. У экспазіцыі – жывапіс, графіка, папяровае мадэліраванне.

Да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання была прымеркавана выстава “Из глубины веков” у Віцебскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі.

19 верасня Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік адзначыў сваё 50-годдзе. Сёння ў яго структуру ўваходзяць 11 музеяў, а таксама 65 аб’ектаў, занесеных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.

19 верасня ў выставачнай зале Расонскага музея баявой садружнасці адкрылася выстава “Расоншчына партызанская”, прымеркаваная да 75-годдзя вызвалення г. п. Расоны партызанскімі брыгадамі імя К. Ракасоўскага і імя І. Сталіна.

У Арт-цэнтры Марка Шагала **ў верасні** адкрылася выстава архіўнай і дакументальнай фатаграфіі “Брынкуш и Шагал. Свободные быть собой”, прысвечаная 130-годдзю з дня нараджэння Марка Шагала і 60-годдзю з дня смерці Канстанціна Брынкуша. У адкрыцці выставы

вечар «Вяртанне праз стагоддзі», арганізаваны цэнтральнай раённай бібліятэкай і цэнтрам культуры і народнай творчасці. Мерапрыемства было прысвечана Дню беларускага пісьменства, жыццёваму і творчаму шляху першага беларускага кнігадрукара Ф. Скарыны. Прыцягвала ўвагу шырока разгорнутая кніжная выстава «Да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання» і карціны Валерыя Шчаснага.

9 верасня ў Шаркаўшчынскім раённым Цэнтры культуры адбылася літаратурна-музычная сустрэча, прысвечаная Дню беларускага пісьменства і 500-годдзю беларускага кнігадрукавання, пад назвай “Не знікне цуд прыгожага пісьменства”. Арганізатарам свята стала літаратурна-музычнае аб’яднанне “Світанак”. На сустрэчу былі запрошаны журналісты, паэты і пісьменнікі, музыканты з Глыбоччыны, Браслаўшчыны і Шаркаўшчыны. Паэты чыталі свае творы, гучала мелодыя беларускай дуды ў выкананні браслаўчаніна Галяша Сялявы, гучалі песні ў выкананні ўзорнага тэатра эстраднай песні “Маленькая фея”, дзіцячага ансамбля “Журавінка” Шаркаўшчынскай ДШМ. Народныя танцы прадэманстраваў фальклорны гурт “Калядзіца”. У фае РЦК работнікамі раённай бібліятэкі была аформлена кніжная выстава “Ад Скарыны да нашых дзён”.

9 верасня ў літаратурнай кафейні Лёзненскага культурна-аздараўленчага цэнтра адбылася сустрэча з пісьменнікам, Ганаровым грамадзянінам г. п. Лёзна Генадзем Пацыенка. Нагода – 80-гадовы юбілей аўтара і прэзентацыя яго кнігі “Когда грустят деревья”. Арганізатар – цэнтральная раённая бібліятэка. Юбіляра віншавалі літаратары Наталля Саветная і Міхаіл Кузьміч, мясцовы краязнаўца Ніна Ціхамірава, вакальны калектыў “Вербніца” ДК аг. Зубкі.

У пачатку верасня жыхары аграгарадка Чырына Дубровенскага раёна святкавалі 410-годдзе свайго населенага пункта. Свята было арганізавана пры падтрымцы Дубровенскага РДК і Дубровенскай ЦБС.

513-ю гадавіну заснавання сваёй малой радзімы адзначылі **ў верасні** жыхары г. п. Ветрына Полацкага раёна. Работнікі гарпасялковага

ДК падрыхтавалі змястоўную канцэртную праграму: вакальныя і харэаграфічныя кампазіцыі, вершы, прысвечаныя ветрынскай зямлі, арыгінальнае дэфіле і інш.

12 кастрычніка ў Гарадоцкім культурна-асветніцкім цэнтры адбыўся літаратурна-музычны вечар «Гэты свет напоўніла яна цяплом і шчасцем», падрыхтаваны супрацоўнікамі цэнтральнай бібліятэкі і краязнаўчага музея. Канцэртную праграму падрыхтавалі салісты Вайханскай бібліятэкі-клуба.

Напярэдадні Дня маці ў Міёрскай цэнтральнай раённай бібліятэцы арганізавалі сустрэчу ўдзельнікі двух творчых калектываў – міёрскага клуба "Бажэна" і аб'яднання "Залаты ўзрост" з Дзісны. Гэта сустрэча стала своеасаблівым майстар-класам па арганізацыі вольнага часу.

У Доме культуры г. п. Руба Віцебскага раёна адбылася літаратурна-асветніцкая вечарына "Октябрь в сердце моем". На сустрэчу з пісьменнікамі Тамарай Красновай-Гусачэнка, Валерыем Марчанка і Канстанцінам Нілавым прыйшлі прадстаўнікі розных пакаленняў.

КЛУБНАЯ СПРАВА

3 верасня ў гарадскім Палацы культуры "Орша" быў праведзены Дзень адчыненых дзвярэй. На канцэрце "Удивительный мир искусства" творчыя калектывы ўстановы культуры прадэманстравалі сваё мастацтва і запрасілі жадаючых далучыцца да творчай сям'і Палаца культуры. У верасні ў культустанове была праведзена творчая сустрэча членаў народнага клуба "Еще не вечер" пад назвай "Есть глаза у всех цветов", прысвечаная маючаму адбыцца 20-гадоваму юбілею аматарскага аб'яднання.

16 верасня ў аграгарадку Далёкія Браслаўскага раёна культработнікі арганізавалі традыцыйнае брэндавае мерапрыемства "Далячанскі бульбаслаў". Вяскоўцы сабраліся на свята, каб ушанаваць "другі хлеб" і аддаць хвалу лепшым бульбаводам. Работнікі мясцовага Дома культуры падрыхтавалі тэатралізаванае прадстаўленне, з

сельскай бібліятэцы і інш.

Да 135-годдзя з дня нараджэння беларускіх пісьменнікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа ў Новалукомльскай бібліятэцы прайшоў гарадскі конкурс чытальнікаў "На кожнай сцяжынцы іх песня і голас".

ДУК «Шаркаўшчынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

3 верасня ў сістэме быў праведзены семінар бібліятэчных работнікаў "Да кніжных скарбаў дакраніся", прысвечаны 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. У рамках семінара адбыўся выезд у старажытны Полацк, дзе праходзіла свята беларускага пісьменства. На пляцоўцы "Фестываль кнігі і прэсы" бібліятэкары прынялі ўдзел у аўтограф-сесіі "Слова пісьменніка", прэзентацыі выставачнага праекта "Я. Купала. 135".

15 верасня ў ЦРБ адсвяткавалі Дзень бібліятэк і 40-годдзе з моманту цэнтралізацыі Шаркаўшчынскай бібліятэчнай сістэмы. На юбілейную вечарыну "На хвалях нашай памяці" былі запрошаны бібліятэкары раёна і ветэраны бібліятэчнай справы. У рамках мерапрыемства было арганізавана тэатралізаванае бібліятэчнае шоу "Адзін дзень з жыцця ЦБС", былі адзначаны бібліятэкі-юбіляры. У падарунак ад раённага Цэнтра культуры быў атрыманы відэафільм "Шаркаўшчынская ЦБС сёння".

ДУК «Шумілінская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

16 верасня ў дзіцячай бібліятэцы прайшоў турнір знаўцаў казкі А. Талстога "Золотой ключик, или Приключения Буратино". **27 верасня** ў раённай бібліятэцы адбылася прэзентацыя новай кнігі Антона Параскевіна "Валуны родной сторонки".

1 кастрычніка ў чытальнай зале ЦРБ прайшла тэматычная сустрэча "Фарбы восені" да Дня пажылых людзей. **14 кастрычніка** ў дзіцячай бібліятэцы была праведзена конкурсна-гульнёвая праграма "Мамы-дочки и сыночки" да Дня маці.

ДУК «Сенненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

1 верасня ў ЦРБ былі запрошаны старшакласнікі горада на ўрок-прэзентацыю “Да вытокаў першапісьменства”.

15 верасня бібліятэкі сістэмы адсвяткавалі Дзень бібліятэк. У ЦРБ прайшоў Дзень адчыненых дзвярэй “Добро пожаловать, читатель!”. Былі афармлены выстава-калаж “Литературная палитра” і выстава-знаёмства “С книгой в XXI век”.

20 кастрычніка на базе Какоўчынскай сельскай бібліятэкі быў праведзены выязны тэматычны семінар “Вольны час у бібліятэцы: арганізацыя, рэклама і правядзенне мерапрыемстваў”. У праграме: выстава-агляд “Імідж бібліятэкі – рэклама”, кірмаш прафесійнай творчасці “Бібліятэка – адкрыты свет ідэй”, выстава “Осенних красок хоровод” і інш.

ДУК «Ушацкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

Гутарку-дыспут да Міжнароднага дня міру пад назвай “Ради мира я готов…” правялі супрацоўнікі дзіцячай бібліятэкі-філіяла № 1. У Кубліцкай бібліятэцы-філіяле № 15 імя Васіля Быкава была арганізавана краязнаўчая гульня “Вѐска, у якой ты жывеш”. **30 верасня** ў дзіцячую бібліятэку завітаў беларускі пісьменнік, паэт, драматург Генадзь Аўласенка і сустрэўся з вучнямі 4-х класаў.

У кастрычніку ў Глыбачанскай бібліятэцы была праведзена пазнавальная гадзіна для дзяцей “Невероятные факты о животных”, у Вялікадолецкай – гадзіна шчырасці “Гэтае святое слова – мама”.

ДУК «Чашніцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

З нагоды 500-годдзя беларускага кнігадрукавання праведзены: гадзіна карыснай інфармацыі “Мовы друкаванай чароўныя словы” ў Чашніцкай гарадской бібліятэцы, дзень выдатнай асобы “Каля вытокаў кнігадрукавання” ў Новалукомльскай гарадской бібліятэцы, літаратурна-музычнае свята “Скарынаву кнігу ў вечнасць пусціць” у Кругліцкай

канцэртнымі нумарамі выступілі самадзейныя артысты з Браслаўскага РЦК.

Напрыканцы верасня ў аграгарадку Асінторф Дубровенскага раѐна было праведзена свята “Королева болотного царства”. У мясцовым Доме культуры былі арганізаваны выставы і канцэртная праграма.

У вѐсках Аршаншчыны **ў верасні** праходзілі святы-брэнды. Работнікі Міцькаўшчынскага сельскага клуба-бібліятэкі правялі свята бульбы “Наш картофель – объеденье, Беларуси талисман”. У вѐсцы Клюкаўка ў другі раз адбылося свята лясных дароў “Лесная сказка-2017”. Актыўны ўдзел у гэтых святах прымалі артысты і творчыя калектывы Аршанскага раѐннага Дома культуры.

Народны ансамбль народнай песні і музыкі “Вераснянка” Мазалаўскага СДК Віцебскага раѐна адсвяткаваў 15-годдзе з дня ўтварэння. Творчая вечарына сабрала ўдзельнікаў ансамбля і яго сяброў – народны жаночы калектыў “Залаты ўзрост”, танцавальны калектыў “Алар”, настаўнікаў дзіцячай школы мастацтваў і колішніх удзельнікаў “Вераснянкі”.

Браслаўскі раѐнны Цэнтр культуры прапанаваў жыхарам раѐна новы від правядзення вольнага часу – паказ кінафільмаў для дзяцей і дарослых з дапамогай відэаперасовачнага комплексу. Першы паказ адбыўся ў аграгарадку Плюсы для ваеннаслужачых. Плануецца, што відэаперасоўка будзе абслугоўваць аграгарадкі і аддаленыя населеныя пункты.

20 кастрычніка адбылася прэм’ера спектакля народнага тэатра пры Талачынскім раѐнным Цэнтры культуры. Творчы калектыў на чале з яго рэжысѐрам Святланай Васільевай ажыццявіў пастаноўку камедыі Лявона Агулянскага “Што баліць?” (пераклад з рускай мовы Зіновія Прыгодзіча).

29 кастрычніка ў Лѐзненскім раѐнным Цэнтры культуры адбыўся першы тур праекта пераўвасабленняў і пародый «Точь-в точь по-лиозненски».

29 кастрычніка ў Пальмінскім СДК Гарадоцкага раѐна быў праведзены раѐнны конкурс “Мистер Совершенство-2017”.

29 кастрычніка на сцэне гарадскога Палаца культуры “Орша” адбылося маштабнае мерапрыемства “Любімаму клубу 20 гадоў”, прысвечанае юбілею народнага ветэранскага клуба “Еще не вечер”. Прысутным быў паказаны відэафільм пра стваральніцу клуба Аляксандру Іванаўну Дзедзінец. У канцэртнай праграме ўдзельнічалі і члены клуба, і шматлікія госці. Прагучалі віншаванні ад прадстаўнікоў ветэранскага клуба “Прометей” з Гомеля, вядомай спявачкі Валянціны Шылавай і многіх іншых.

ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ

У шосты раз **вераснёўскія** Міёры сабралі гасцей на экалагічны фестываль “Жураўлі і журавіны Міёрскага краю”. Як адзначыў на прэс-канферэнцыі старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў, фэст занесены ў топ-5 брэндавых святаў Беларусі. Гэты ўнікальны культурны праект дазваляе захоўваць і памнажаць традыцыі міёрскага краю, папулярызаваць самабытную мясцовую прыроду і ўносіць пэўны ўклад ва ўмацаванне міжнацыянальнага супрацоўніцтва. Сѐлета на свята прыехалі дэлегацыі з расійскай Апочкі на чале з кіраўніком раёна Юрыем Ільіным, Глыбоцкага і Шаркаўшчынскага раёнаў, намеснік Пастаяннага прадстаўніка Праграмы развіцця ААН у Беларусі Закары Тэйлар, кіраўнікі праектаў ПРААН у нашай краіне Ігар Чульба і праекта “Тарфянікі-2” Аляксей Арцюшэўскі, дырэктар ГА Ахова птушак Бацькаўшчыны” Аляксандр Вінчэўскі. На цэнтральнай плошчы райцэнтра адбылося адкрыццѐ скульптурнай кампазіцыі “Жураўліная вернасць”. На экалагічным свяце былі падведзены вынікі конкурсаў па добраўпарадкаванні вытворчых тэрыторый, домаўладанняў, работы старэйшынаў. Былі ўзнагароджаны пераможцы конкурсу сельскіх падворкаў “Жураўліны кірмаш” і лепшыя зборшчыкі журавін. Вучні экалагічнага класа Германавіцкай школы разам з настаўнікамі адкрылі экалагічную сцежку на балота “Ельня” з боку Шаркаўшчынскага раёна. Рамеснікі дэманстравалі свае вырабы, бібліятэкары знаѐмілі з літаратурай

Паўлавіч Кулакоў, які таксама піша вершы.

10 кастрычніка ў літаратурнай кавярні “Пад абажурам” для навучэнцаў СШ № 1 райцэнтра быў праведзены краязнаўчы віртуальны экскурс «Ёсць імѐны, ѐсць такія даты...» (да Дня вызвалення Лѐзна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў), арганізаваны супрацоўнікамі раённай бібліятэкі.

ДУК «Полацкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

8 верасня ў дзіцячай бібліятэцы імя Л. Талстога адбылося адкрыццѐ цэнтра чытання і актыўнай творчасці “Библио Puzzlle”. 12 верасня былі праведзены першыя заняткі “Чытанне з пялѐнак”.

21 верасня ў бібліятэцы імя Янкі Купалы адбылося пасяджэнне літаратурна-музычнай гасцѐўні “Под сенью духовности”. У рамках мерапрыемства прайшла духоўна-асветніцкая сустрэча “Полацкая епархія: гісторыя і сучаснасць”.

У кастрычніку бібліятэка імя Герцэна правяла “Мамін дзень у бібліятэцы” і пазнавальна-забаўляльную гадзіну “Бібліятэка – наш лепшы сябар” (да 70-годдзя бібліятэкі); дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога правяла конкурсна-гульнѐвую праграму “Бабушка моей мечты”, этнаграфічны квэст “Бацькоўская хата ўсім багата”, пазнавальны трэнінг “Наш сябар – флікер”. У бібліятэцы імя Я. Купалы ў межах краязнаўчай праграмы «Мой город – Родины частица» прайшоў краязнаўчы турнір “Ад Полацка пачаўся свет”.

ДУК «Пастаўская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У верасні супрацоўнікамі ЦРБ былі праведзены вусны часопіс “Ля вытокаў кнігадрукавання” ў СШ № 2 і бібліяграфічны агляд “Прэса на ўсе інтарэсы” ў аддзяленні дзѐннага знаходжання грамадзян пажылога ўзросту ТЦСАН.

2 кастрычніка аддзел бібліятэчнага маркетынгу раённай бібліятэкі арганізаваў сустрэчу былых работнікаў ЦБС, прымеркаваную да Дня пажылых людзей.

27 кастрычніка адбылося свята “БиблиоПривет! Нам 70 лет!”, прысвечанае юбілею Асінторфскай сельскай бібліятэкі – цэнтра экалагічнай асветы. У праграме: відэапрагляд, кніжная выстава “Листая страницы твои в юбилей”, фотавыстава «Библиотечный цвет», віншаванні.

ДУК «Лепельская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У верасні супрацоўнікамі ЦРБ праведзены: свята кнігі “Да кніжных скарбаў дакраніся” ў гарадскім парку; Дзень адчыненых дзвярэй “Библиотека – храм знаний и добра”; адкрыццѐ выставы вучаніцы мастацкага аддзялення ДШМ Таццяны Трубека «Я и мой мир» (галерэя “АРТ-Лепель”); пазнавальна-інфармацыйная гадзіна для людзей з абмежаваными магчымасцямі “Этикет для двоих” (мультымедыйны цэнтр).

21 верасня праведзена выязное пасяджэнне клуба “Добрыя сустрэчы” сумесна з клубам цікавых сустрэч “Ушачане” ва Ушацкай раѐннай бібліятэцы.

23 кастрычніка ў ЦРБ адбылося пасяджэнне маладзѐжнага клуба “Я – грамадзянін Рэспублікі Беларусь” пад назвай “Жыццѐ даўжынѐю ў 110 гадоў”, прысвечанае 110-годдзю раѐннай бібліятэкі і 500-годдзю беларускага кнігадрукавання.

ДУК «Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

11 верасня на кафедры праваслаўнай літаратуры ЦРБ адбылося пасяджэнне камісіі па праваслаўных бібліятэках і кафедрах праваслаўнай літаратуры. На ім прысутнічалі члены камісіі Смаленскай епархіі і Віцебскай дыяцэзіі. На пасяджэнні гаворка ішла пра мэты і задачы, значэнні кафедраў праваслаўнай літаратуры, пра вопыт іх дзейнасці на Смаленшчыне.

27 верасня літаратурная гасцѐўня ЦРБ запрасіла вучняў СШ № 1 райцэнтра на мерапрыемства “Дарога, закалыханая жытам”, прысвечанае 105-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Максіма Танка. На сустрэчы прысутнічаў унучаты пляменнік паэта па матчынай лініі Васіль

па экалогіі, мастацкія калектывы, у ліку якіх былі і даўгаўпілскія “Пралескі”, парадавалі сваімі выступленнямі.

Традыцыйнае абласное свята-конкурс мастацкай творчасці і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва людзей з абмежаванымі магчымасцямі “Солнечный мир для всех” прайшло ў Віцебску. Гэты праект ужо ў шосты раз рэалізуе Віцебскі абласны краязнаўчы музей. На працягу **верасня** ў ратушы працавала выстава 230 работ, выкананых у розных тэхніках. Для ўдзельнікаў свята выступілі лепшыя калектывы мастацкай самадзейнасці Цэнтра культуры “Віцебск”.

9 верасня ў г. п. Баравуха Полацкага раѐна быў праведзены VII рэгіянальны экалагічны фестываль “Крыніца здароўя пад Нафтаградам”. На галоўнай сцэнічнай пляцоўцы выступалі лепшыя творчыя калектывы Наваполацка: Палаца дзяцей і моладзі, Цэнтра культуры, дзіцячай школы мастацтваў № 3. Святочную атмасферу экафэсту задавалі выставы дэкаратыўна-прыкладной творчасці, праваслаўнай літаратуры, прэзентацыі дасягненняў і праектаў па здаровым ладзе жыцця. У рамках фестывалю быў рэалізаваны новы праект – “Вяселле ў беларускім народным стылі”.

17 верасня ў аграгарадку Валынцы Верхнядзвінскага раѐна ў дзясяты раз прайшло рэгіянальнае свята “Збіраем зорны карагод”, якое сабрала на сцэне мясцовага СДК творчыя калектывы Верхнядзвіншчыны, Полацка і Наваполацка, гасцей з Расіі і Латвіі. Па добрай традыцыі караваямі сустракалі сяброў з замежжа – Язэпа Дабкевіча, арганізатара па знешніх сувязях Краслаўскай краявой Думы, Марыю Міцкевіча, кіраўніка аддзела адукацыі і культуры Дагдскага краю, Алену Маславу, дырэктара Ідрыцкага Дома культуры Себежскага раѐна Пскоўскай вобласці, а таксама іх творчыя дэлегацыі. Адбылася прэзентацыя галерэі “Мы шчаслівыя, калі мы разам”, дзе лепшыя майстры аматарскіх аб’яднанняў і клубаў па інтарэсах раѐна прадставілі свае вырабы. Працавала фотаэкспазіцыя “Музыка нас звязала”. Пад такой назвай адбыўся і юбілейны гала-канцэрт. (*Дзвінская праўда. – 2017. – 26 верас. – С. 5.*)

23 верасня ў парку адпачынку Наваполацка было праведзена гарадское свята нацыянальнай культуры “Вераснѐвая палітра”. Супрацоўнікі і клубныя фарміраванні Цэнтра рамѐстваў і традыцыйнай культуры падрыхтавалі шэраг этнапляцовак: майстэрні па розных відах рамѐстваў, сярэднявечны пляц клубаў гістарычнай рэканструкцыі імя В. Ю. Ластоўскага і “Чорны война”, пляцоўку нацыянальнай кухні і інш. Карціну свята арганічна дапаўняла насычаная культурна-забаўляльная праграма. Гледачы ўбачылі фальклорную пастаноўку па матывах свята беларускага земляробчага календара “Багач”. Гурт архаічных спеваў “Княжыч” прапанаваў забаўляльны блок па развучванні народных танцаў і гульняў. Канцэртная праграма, падрыхтаваная артыстамі Цэнтра культуры, уражвала прысутных багаццем традыцыйнай культуры.

23 верасня ў г. п. Арэхаўск Аршанскага раѐна адбылося раѐннае свята “Майстры мастацтваў – працаўнікам сяла” з удзелам творчых калектываў Аршанскага РДК, Арэхаўскай дзіцячай школы мастацтваў і Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі Міхаіла Дрынеўскага. У фае Дома культуры праходзіла выстава-продаж керамічных вырабаў Копыскага Цэнтра народнай творчасці і рамѐстваў.

Раѐннае свята народных талентаў “А музыкі граюць, граюць…”, прысвечанае памяці сапраўднага народнага музыкі, віртуознага бычыхінскага майстра Івана Іўлева, прайшло **24 верасня** ў Вархоўскім СДК Гарадоцкага раѐна. Гармонік і прыпеўка на свяце ішлі побач. Свята дало магчымасць сустрэцца аматарам народнай музыкі, а гармонік, цымбалы ды песні згуртавалі яе шчырых прыхільнікаў. Арганізаваў мерапрыемства Гарадоцкі Цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці.

8 кастрычніка на Пастаўшчыне ў шосты раз прайшоў міжнародны конкурс “Майстры вѐскі”. Сѐлета ѐн праходзіў у аграгарадку Камаі з удзелам трох сем’яў з Пастаўскага раѐна і сем’яў Поўхс і Зупа з Рэзекненскага і Віесіцкага краявых самакіраванняў Латвіі. У фае Дома

фотахроніка” і інш. Для маленькіх чытачоў праведзены інтэрактыўныя экскурсіі па бібліятэцы – **“**Книжкин дом” і “Библиотечная мозаика**”.**

19 кастрычніка на пасяджэнні жаночага клуба “Сучасніца” ў ЦРБ адбылася сустрэча з віцебскай пісьменніцай Вольгай Маслюковай, членам Расійскага саюза пісьменнікаў і Беларускага літаратурнага саюза “Полоцкая ветвь”. Пісьменніца прадставіла свае кнігі, прачытала вершы. На суд паклоннікаў творчасці пісьменніцы быў прадстаўлены монаспектакль паводле апавядання **“**Малітва маці**”** ў выкананні воіна-інтэрнацыяналіста, лаўрэата музычных конкурсаў Віктара Пахомчыка.

ДУК «Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк»

15 верасня супрацоўнікі раѐннай бібліятэкі запрасілі наведвальнікаў на Дзень адчыненых дзвярэй **“**Мудрых книг хранитель вечный**”.** Сярод мерапрыемстваў – сустрэча школьнікаў з дзіцячай пісьменніцай Святланай Гук у літаратурна-музычнай гасцѐўні.

18 кастрычніка на базе Кабішчанскай сельскай бібліятэкі ў рамках тэматычнага выязнога семінара «Роля сямейнага чытання ў жыцці сучаснай сям’і і дзіцяці» адбыўся літаратурна-музычны вечар-ушанаванне «Прекрасней нет на свете мамы».

ДУК «Докшыцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У рамках святкавання Дня бібліятэк у ЦРБ быў арганізаваны конкурс прафесійнага майстэрства “Дзелавая жанчына ЦБС”. Зацікавіла ўсіх і мерапрыемства “Есці пададзена, або Меню літаратурных герояў”, у якім удзельнічалі члены клубаў “Сустрэча” і “Дакшычанка”.

ДУК «Дубровенская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

30 верасня на абласным фестывалі-кірмашы працаўнікоў вѐскі “Дажынкі-2017” бібліятэкарамі ЦБС была арганізавана пляцоўка “Знакамітыя землякі” ў рамках праекта “Дубровеншчына вітае”.

вебінары «Маркетинговые ориентации современной библиотеки», арганізаваным Віцебскай абласной бібліятэкай імя У. І. Леніна і Магілёўскай абласной бібліятэкай імя У. І. Леніна.

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Верхнядзвінскага раёна»

15 верасня Верхнядзвінская ЦРБ імя Т. Хадкевіча адзначыла «Дзень бібліятэк». Для чытачоў і гасцей была арганізавана выстава кніжных навінак «Новыя кнігі. Новыя імёны». У холе бібліятэкі можна было палюбавацца на дары восені і кветкавыя кампазіцыі, кніжныя інсталяцыі, пазнаёміцца з фотагалерэяй чытачоў і выставай-віншаваннем «Свет, у якім грэецца душа»; на абанеменце – загадаць свае самыя запаветныя жаданні пры дапамозе «Чароўнага калодзежа жаданняў». Новыя карыстальнікі прынялі ўдзел у акцыі-кампліменце ад бібліятэкі «У свет інфармацыі праз бібліятэку!». Па горадзе курсіраваў бібліёбус з надпісам «Чытаем усе!».

11 кастрычніка дзіцячая бібліятэка сумесна з раённым аб'яднаннем прафсаюзаў арганізавала акцыю «Павіншуем маму разам!» да Дня маці.

13 кастрычніка ў ЦРБ прайшла сустрэча «Святло мацярынскай любові». Была разгорнута кніжная выстава “Усё пра цябе адну”. Выступілі Благачынны Верхнядзвінскай акругі, настаяцель Храма Свяціцеля Мікалая Цудатворца айцец Валянцін і начальнік аддзела ЗАГС Верхнядзвінскага райвыканкама Алена Карценка.

ДУК «Віцебская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

Дню бібліятэк у ЦРБ быў прысвечаны Дзень адчыненых дзвярэй “Прыходзьце да нас у бібліятэку, у нас – свята!”. Дзейнічалі кніжна-інфармацыйная выстава “Нашай бібліятэцы – 70!” і фотавернісаж “Літаратурны персанаж**”,** працаваў **“**Банк чытацкіх ідэй**”,** дэманстраваліся відэасюжэты лепшых мерапрыемстваў **“**Наша бібліятэка: юбілейная

культуры ўдзельнікі конкурсу дэманстравалі фірменыя прысмакі, вышыўку, вырабы з бісеру, разьбу па дрэве і інш. Вялікую канцэртную праграму падрыхтавалі ўдзельнікі тэатра песні “Вясковы экстрым” Камайскага СДК, ансамбль народнай музыкі “Маладзіца” і навучэнцы Навасёлкаўскага філіяла Варапаеўскай ДШМ.

21 кастрычніка на базе Ушацкага раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці было праведзена абласное свята-конкурс вясельных абрадаў “Вялікая вясельніца-2017”. Самай відовішчнай часткай свята стала рэканструкцыя старадаўняга вяселля, дзе былі прадстаўлены традыцыі Ушацкага, Глыбоцкага і Шаркаўшчынскага краю. Затым адбыўся конкурс вясельных кутоў – новаўвядзенне сёлетняй “Вялікай вясельніцы”. За першынство ў “Паказе вясельных абрадаў” змагаліся паўтара дзясятка творчых калектываў вобласці. На сцэне Ушацкага РЦК і НТ гледачы ўбачылі сватанне і стаўбавы абрад, заручыны-запоіны і гараджэнне дарогі, зборную суботу і выпяканне вясельнага караваю. Кампетэнтнае журы на чале з дырэктарам Віцебскага АМЦНТ Кацярынай Лабука прысудзіла Гран-пры ў галоўнай намінацыі конкурсу “Унікальныя вясельныя звычаі і абрады” гаспадарам свята – ушачанам. (*Патрыёт. – 2017. – 25 кастр. – С. 1, 5.*)

21–22 кастрычніка ў Віцебску адбыўся форум народных і сучасных рамёстваў “Город, открытый творчеству”. У ліку арганізатараў – галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама. У памяшканні гандлёвага цэнтра “Green” 35 народных майстроў і рамеснікаў вобласці праводзілі майстар-класы, працавала выстава-кірмаш “Грани таланта”, выступалі творчыя калектывы, праводзілася гульнёва-забаўляльная праграма. Мерапрыемства садзейнічала адраджэнню, развіццю, папулярызацыі лепшых традыцый і дасягненняў нацыянальнай культуры і мастацтваў, падтрымцы творчага патэнцыялу Віцебскага рэгіёна.

23–25 кастрычніка ў Аршанскім ГЦК “Победа” адбыўся раённы фестываль-конкурс самадзейнай творчасці “Серебряный век-2017”. Свае

таленты прадэманстравалі звыш 100 удзельнікаў. Раённы савет ветэранаў уручыў спецыяльныя дыпломы. Сярод узнагароджаных быў і старэйшы ўдзельнік фестывалю – 95-гадовы ветэран Вялікай Айчыннай вайны Станіслаў Антонавіч Сяліцкі.

27 кастрычніка ў Канцэртнай зале “Віцебск” прайшоў абласны этап Рэспубліканскага фестывалю творчасці прафсаюзных і ведамасных клубных устаноў “Нашы таленты табе, Беларусь!”. Затым у культурна-спартыўным цэнтры Віцебскага аддзялення Беларускай чыгункі былі падведзены вынікі творчага спаборніцтва. У рамках мерапрыемства быў праведзены “круглы стол” членаў журы і кіраўнікоў клубных устаноў па пытаннях развіцця культуры і арганізацыі вольнага часу ў працоўных калектывах.

27–28 кастрычніка ў гарадскім Палацы культуры “Орша” адбыўся Міжнародны фестываль-эстафета патрыятычнай (афганскай) песні “Сердцем причастны. Холм (Россия) – Орша (Беларусь)” з удзелам самадзейных артыстаў Оршы, Полацка, Віцебска, Расіі, Латвіі, Германіі.

БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА

2 і 3 верасня ў святкаванні Дня беларускага пісьменства ў Полацку ўдзел брала і Нацыянальная бібліятэка Беларусі. 2 верасня на плошчы Ф. Скарыны адбыўся “Фестываль кнігі і прэсы”, у час якога прайшлі прэзентацыя і ўрачыстая перадача дырэктарам НББ Раманам Матульскім у дар Полацкай ЦГБ імя Ф. Скарыны факсімільнага выдання “Кніжная спадчына Францыска Скарыны”. 3 верасня ўдзельнікі святочных мерапрыемстваў пазнаёміліся з трыма выдавецкімі праектамі НББ – альбомам “Асветнік з Полацка: ушанаванне Францыска Скарыны”, ілюстраваным навукова-папулярным выданнем “Вільня часоў Францыска Скарыны” і зборнікам п’ес “Францыск Скарына і сучаснасць”. Цікавасць вызвалі тэматычная кніжная выстава “Захоўваючы нацыянальную кніжную спадчыну” і ілюстрацыйная “Пяць стагоддзяў беларускага кнігадрукавання”. Для дзяцей праводзіліся заняткі пазнавальна-

запрасілі навучэнцаў школ горада прыняць удзел у квэсце «Велаэрудыт».

Супрацоўнікі бібліятэкі імя У. Караткевіча да Дня пажылога чалавека правялі акцыю «З адкрытым сэрцам, з добрым словам» і інтэлектуальную гульню «Што? Дзе? Калі?».

15 кастрычніка ў ЦБ імя У. Маякоўскага адбылося святочнае мерапрыемства, прысвечанае адразу двум святам – Дню маці і святу Пакрава Прасвятой Багародзіцы.

135-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа сваю акцыю «Вершы Я. Купалы і Я Коласа чытаем разам» прысвяцілі супрацоўнікі бібліятэкі імя С. Маршака.

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Браслаўскага раёна»

3 верасня работнікі ЦРБ правялі літаратурна-гістарычны экскурс па выставе-галерэі “Скарынінскі шлях”. Мерапрыемства праходзіла на пляцоўцы ля цэнтральнай бібліятэкі і было прымеркавана да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. Адбылося ўрачыстае адкрыццё памятнай таблічкі з міжнародным нумарам, які сведчыць аб прыналежнасці браслаўскай “Свабоднай бібліятэкі” да міжнароднага згуртавання вулічных бібліятэк.

8–15 верасня праводзіўся раённы Тыдзень бібліятэк. У праграме: выстава-рэйтынг “ВООК-сімпатыі” (хіт-парад любімых кніг супрацоўнікаў бібліятэкі); рэкламная акцыя “Проспект читающих людей”; літаратурны бульвар “Чытаем разам, чытаем па-беларуску” і інш.

24 кастрычніка ў ЦРБ адбыўся раённы семінар на тэму “ Сучасныя мадэлі прапаганды літаратуры ў публічных бібліятэках: лепшыя традыцыі і інавацыйныя падыходы”.

Загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Ірына Макарэвіч выступіла з дакладам «Библиотека вне стен: реализация проекта «Свободная уличная библиотека» на Міжнароднай канферэнцыі «Библиотека. Больше чем всегда» ў ЦБ імя Я. Купалы (г. Мінск) і

праграму бальных танцаў беларускай шляхты таго часу. З музычным фальклорам наведвальнікаў свята пазнаёмілі ансамбль цымбалістаў “Гарэзлівыя перазвоны” ДУ “Цэнтр культуры “Віцебск” і вакальны калектыў “Ярылава кола”. Зацікавілі прысутных праграмы “Чароўная ноч: фокусы і ілюзіі”, “Неба вакол нас…”, кінасалон “Класіка+Кіно”, флэш-моб “Бібліягалактыка” і інш.

28 верасня ў ЦГБ імя М. Горкага адбылася вечарына-прысвячэнне “Любоў мая – мелодыя…” (да 75-годдзя Мусліма Магамаева) пры падтрымцы Цэнтра нацыянальных культур ДУ “Цэнтр культуры “Віцебск” і прадстаўнікоў культурнай дыяспары Азербайджана.

10 кастрычніка ў ЦГБ імя М. Горкага была праведзена літаратурна-музычная вечарына “Судьба и время: Марина Цветаева»;

12 кастрычніка работнікі бібліятэкі імя Е. Лось правялі літаратурную гадзіну “Матуліным сэрцам змалку сагрэты мы” ў інтэрнаце № 3 ВДМУ; **17 кастрычніка** ў бібліятэцы імя У. Караткевіча адбылася літаратурна-музычная імпрэза “Душа народа ў песнях тых жыве” (да 135-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа).

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Наваполацка»

Цэлы тыдзень (**11–17 верасня**) у бібліятэках ЦБС прайшоў пад знакам прафесійнага свята – Дня бібліятэк. У кожным філіяле была падрыхтавана маса рознапланавых акцый, выстаў і мерапрыемстваў. Уся прастора ЦБ імя У. Маякоўскага ў гэтыя дні ператварылася ў вялікую выставу-інсталяцыю «Кніга як артэфакт» – арыгінальныя, нестандартныя скульптуры з кніг рознай тэматыкі і велічыні: сава, бібліятэка, торт, букеанарыум, бібліяфіл. А ў чытальнай зале можна было пазнаёміцца з кніжным жывапісам па тэхніцы Ісаака Салазара «Book of Art». Яркім фіналам Тыдня бібліятэк стала музычна-паэтычная прэзентацыя выставы мінскай мастачкі Эльгі Паповай «Волшебство – оно повсюду».

У рамках гарадскога «мабільнага тыдня» **18 верасня** бібліятэкі ЦБС

забаўляльнага праекта “Пазітыў ад Скарыны”. (*Краязнаўчая газета. – 2017. – № 34 (верас.). – С. 4.*)

ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

1 верасня ў рамках Дня ведаў для вучняў 4-х класаў ДУА «Сярэдняя школа № 28 г. Віцебска» быў праведзены бібліятэчны ўрок «Шляхам Скарыны», прысвечаны 500-годдзю беларускага кнігадрукавання.

2 верасня ў Полацку супрацоўнікі Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна прадставілі абласную выставу-агляд самаробнай кнігі “Кнігу горада гартаючы”, прымеркаваную да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання.

12 верасня ў аддзеле перыядычных выданняў у рамках гарадскога «Тыдня сям'і» пры падтрымцы Віцебскага абласнога грамадскага аб'яднання праваслаўных жанчын прайшоў сямейны вечар «Мой свет – мая сям'я».

14 верасня ў бібліятэцы прайшоў цыкл мерапрыемстваў, прымеркаваных да Дня бібліятэк Беларусі. На ўрачыстым адкрыцці чытачоў і калег павіншавала дырэктар бібліятэкі Таццяна Адамян. Традыцыйна ў фае адбылася выстава-панарама новых паступленняў кніг у фонд аддзела абанемента і МБА «Калейдаскоп кніжных навінак». Значнай падзеяй Дня бібліятэк стала прэзентацыя шостага выпуску альманаха «Дзвіна: Віцебшчына літаратурная». З выхадам кнігі літаратараў вобласці павіншавалі начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Генадзь Ягораў і начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага гарвыканкама Наталля Шыянок. Вялікі рэзананс выклікала прэзентацыя выставы смаленскіх мастакоў Генадзя Намяроўскага (графіка) і Валерыя Грашчанкава (скульптура). Прайшло ўрачыстае падвядзенне вынікаў і ўзнагароджанне пераможцаў абласной выставы-агляду самаробнай кнігі «Кнігу горада гартаючы», прымеркаванай да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. Пераможцы атрымалі памятныя

прызы. У рамках свята былі падведзены вынікі фотаконкурсу «Кніга – мой сябар», які праводзілі супрацоўнікі аддзела літаратуры па мастацтве сярод фатографаў-аматараў горада. У сектары замежнай літаратуры студэнты ВДУ імя П. М. Машэрава правялі для навучэнцаў гімназіі № 7 г. Віцебска інтэрактыўны ўрок англійскай мовы «Из века в век шагает с книгой человек». Майстар-клас па рабоце з фотарэдактарам Editor.Pho.to «Урокі чараўніцтва: апрацоўка фотаздымкаў» для навучэнцаў гімназіі № 5 г. Віцебска правялі супрацоўнікі электроннай чытальнай залы. Сустрэча «Выканаўцы правасуддзя» намесніка начальніка аддзела прымусовага выканання Чыгуначнага раёна г. Віцебска Вольгі Дашкевіч і метадыста Віцебскай абласной натарыяльнай палаты Вольгі Пятровай са студэнтамі ВНУ горада прайшла ў сектары «Публічны цэнтр прававой інфармацыі». На бібліятэчным уроку «Берасцяныя пасланні» навучэнцы гімназіі № 7 г. Віцебска разам з супрацоўнікамі аддзела дзіцячай літаратуры зрабілі берасцяныя граматы. Для чытачоў з абмежаванымі магчымасцямі прайшлі прэзентацыі выстаў: выданняў «Чытанне з захапленнем», творчых работ інвалідаў і людзей пажылога ўзросту «Тэрыторыя творчасці» (сумесна з Цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Чыгуначнага раёна г. Віцебска), выданняў, надрукаваных шрыфтам Брайля «Займальны свет на кончыках пальцаў», аўдыякніг «Кнігі, якія гучаць» (бібліятэчны праект «Разам» аддзела перыядычных выданняў). Літаратурна-музычны вечар «Скарынаву кнігу ў вечнасць пусціць...» правялі для навучэнцаў сярэдніх навучальных устаноў г. Віцебска супрацоўнікі агульнай чытальнай залы. У гэтым жа аддзеле можна было ўбачыць унікальную выставу рэдкіх выданняў канца XIX – пачатку XX стагоддзяў «Былых часоў сведкі». Усе жадаючыя наведалі прэзентацыі другога тома зборніка «Віцебскі край», кнігі Канстанціна Карпекіна «Иудейские общины в Белорусской ССР (январь 1919 – сентябрь 1939 гг.)» і сустрэчу з краязнаўцам, мастаком, фатографам Віктарам Барысенкавым з цыкла «Краязнаўчыя сустрэчы». Майстар-клас Анастасіі Прунікавай па вырабе традыцыйнай беларускай лялькі адбыўся ў аддзеле эканамічнай, тэхнічнай і сельскагаспадарчай

гісторыкаў, супрацоўнікаў музеяў, бібліятэк, прадстаўнікоў рэлігійных і грамадскіх арганізацый, устаноў адукацыі з Беларусі, Расіі, Латвіі. 35 выступоўцаў прынялі ўдзел у рабоце наступных секцый: «Служэнне жанчын у Праваслаўнай Царкве», «Жанчыны ў войнах і ўзброеных канфліктах», «Працоўны подзвіг жанчын у гісторыі Беларусі».

26 кастрычніка былі праведзены чарговыя заняткі бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада». Тэма заняткаў: «1917 год у Віцебску». Перад прысутнымі выступілі кандыдаты гістарычных навук Дзяніс Юрчак, Аляксандр Дзядзінкін, Віктар Хаданёнак, Віктар Акуневіч, вядучы архівіст Дзяржархіва Віцебскай вобласці Святлана Мясаедава, загадчык Віцебскага мастацкага музея Вольга Акуневіч. Быў прадэманстраваны ўрывак з дакументальнай стужкі пра рэвалюцыйныя падзеі ў Віцебску.

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска»

Дзень бібліятэк у ЦГБ імя М. Горкага быў адзначаны насычанай сацыякультурнай акцыяй “Бібліяноч – 2017”. У бібліятэчным праекце “Кнігі майго жыцця” чытачы сустрэліся з вядучым майстрам сцэны тэатра імя Я. Коласа Пятром Ламанам; у праекце “Віцебск: ад старажытнасці да сучаснасці” адбылася сустрэча з кандыдатам гістарычных навук, дацэнтам кафедры гісторыі Беларусі ВДУ імя П. Машэрава Мікалаем Піваварам. Тэтралізаванае прадстаўленне “Шекспір: любіл, люблю, любім” прадставілі навучэнцы УА “Віцебскі дзяржаўны каледж культуры і мастацтва”. У літаратурным кафэ «Под Абажуром» сабраліся аматары паэзіі і літаратары: Алена Крыклівец, Алег Сяшко, Вольга Маслюкова, Наталля Салаўёва і інш. Упрыгожыла свята выстава каляровай графікі “Казкі старога Усходу” Цімура Гарыпава, якая была дапоўнена ўсходнімі танцамі ў выкананні калектыву «Аман Хаят» (фітнес-клуб «Нон – стоп»). А члены клуба культурна-гістарычнай рэканструкцыі “Паўночная вежа” перанеслі гасцей свята ў першую палову XIX стагоддзя і прадставілі

падрыхтаваны сумесна з тэатрам імя Я. Коласа.

23 кастрычніка ў сектары замежнай літаратуры адбылося мерапрыемства, прымеркаванае да Дня Незалежнасці Рэспублікі Туркменістан. Нацыянальны партрэт «Туркменістан – краіна залатых пяскоў, жвавых скакуноў і выдатных дываноў» – так назвалі яго арганізатары.

24 кастрычніка ў бібліятэцы адбыўся творчы вечар паэта Мікалая Намеснікава «Куда ведѐшь, любовь моя и вера?..». Мікалай Уладзіміравіч – загадчык секцыі паэзіі Віцебскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі», лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Петруся Броўкі. У гэты дзень паэт атрымаў пачэсную ўзнагароду – медаль «За вялікі ўклад у літаратуру».

25 кастрычніка адбылася прэзентацыя беларускага перакладу кнігі выбраных вершаў шведскага нобелеўскага лаўрэата Тумаса Транстромера «Пад вольным небам». У гэты дзень бібліятэку наведалі саветнік Пасольства Швецыі ў Рэспубліцы Беларусь Б'ѐрн Сула, памочнік пасла Швецыі ў Рэспубліцы Беларусь Алеся Літвіноўская, намеснік старшыні ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў» Усевалад Сцебурака, перакладчык Лявон Баршчэўскі, музыка Андрэй Такінданг.

Супрацоўнікамі інфармацыйна-бібліяграфічнага аддзела бібліятэкі падрыхтаваны анатаваны бібліяграфічны спіс «Событие эпохальное: к 100-летию Октябрьской революции 1917 года».

26 кастрычніка ў бібліятэцы адбылася Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Женский подвиг в истории Беларуси. 1917–2017 годы». Заснавальнікі – Міжнародная грамадская арганізацыя «Саюз праваслаўных жанчын», ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У І. Леніна», Віцебскае абласное аб'яднанне праваслаўных жанчын, Сястрыцтва ў гонар святой роўнаапостальнай княгіні Вольгі ў г. Віцебску Віцебскай епархіі Беларускай Праваслаўнай Царквы. Для ўдзелу ў канферэнцыі было пададзена больш за 40 заявак ад краязнаўцаў,

літаратуры. Супрацоўнікі аддзела правялі выставу кніг па кулінарыі «Смачныя» кнігі» і дэгустацыю страў. Персанальную фотавыставу прадставіла гасцям бібліятэкі віцебскі фатограф Ірына Дзянісава. Упрыгожваннем свята сталі музычныя творы ў выкананні выкладчыка ДШМ № 5 г. Віцебска Юліі Сабалеўскай (скрыпка), выкладчыка ДШМ № 4 г. Віцебска Аляксандра Аўчыннікава і яго вучаніц Уладзіславы Скапы і Паліны Чарнышовай (саксафон), трыа выкладчыкаў ДШМ № 1 г. Віцебска Кацярыны Трусавай, Ганны Валашчук, Андрэя Жагорава. Для гасцей бібліятэкі былі адкрыты выставы: перыядычных выданняў «Свет перыѐдыкі», дзіцячай літаратуры «Дзіцячы час», лялек «Такія розныя лялькі», кніжныя развалы «Чытач – чытачу». У нямецкай чытальнай зале працаваў бібліямаркет «Адкрывай і выйгравай!» («Entdecke und gewinne!») для чытачоў, якія валодаюць нямецкай мовай. Чытачы бібліятэкі бралі ўдзел у віктарыне па гісторыі г. Віцебска (па матэрыялах курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада»). Экскурсіі па бібліятэцы ў гэты дзень наведалі больш за 250 чалавек. Святочныя мерапрыемствы для дзяцей прайшлі ў аддзеле дзіцячай літаратуры. Партнѐрамі і спонсарамі свята выступілі: Віцебская абласная арганізацыя Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, спорту і турызму, упраўленне спорту і турызму Віцебскага аблвыканкама, Віцебскае абласное грамадскае аб'яднанне праваслаўных жанчын, прадпрыемствы КВУП «Кандытарская фабрыка «Віцьба, прадпрыемствы ТДА «Беліта Вітэкс», ТАА «ВВП Часпром», магазін бытавой тэхнікі «Вулкан», багетны салон індывідуальнага прадпрымальніка Паўла Азарчанкі.

19 верасня адбылася прэзентацыя новай кнігі паэта, перакладчыка Уладзіміра Папковіча «На шалях лѐсу». У кнігу ўвайшлі творы, напісаныя паэтам у 2015–2016 гг., размешчаныя ім на ўласнай старонцы ў Фэйсбуку. У год 500-годдзя беларускага кнігадрукавання У. Папковіч перадаў у падарунак Віцебскай абласной бібліятэцы кнігі пра Францыска Скарыну і кнігі класікаў беларускай літаратуры з уласнай бібліятэкі.

21 верасня прайшла прэзентацыя кнігі Антона Параскевіна

(Віктара Улюценкі) «Валуны родной сторонки». Гэта шостая кніга аўтара. Старшыня Віцебскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Тамара Краснова-Гусачэнка расказала пра жыццёвы і творчы шлях Віктара Улюценкі і ўручыла яму вышэйшую ўзнагароду Саюза пісьменнікаў Беларусі – медаль «За вялікі ўклад у літаратуру».

27 верасня ў бібліятэцы адбылося падвядзенне вынікаў конкурсу відэаролікаў «Я – из Витебска!», прысвечанага 85-годдзю Д Р. Сімановіча. Гэта падзея завяршыла цыкл мерапрыемстваў, прысвечаных 85-годдзю паэта. У рамках вечара былі прадэманстраваны работы, дасланыя на конкурс. Зрабіць мерапрыемства па-сапраўднаму святочным дапамаглі салісты вакальнай студыі ДУА «Гімназія № 1 г. Віцебска» Собалева Насця і Фалькова Марыя і ўзорны харэаграфічны калектыў «Акцэнт». Дыплом пераможцы I ступені атрымаў творчы калектыў ДУА «Сярэдняя школа № 38 г. Віцебска» за відэаролік «Однажды в сентябре».

28 верасня ў бібліятэцы пачаўся новы сезон бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада». Тэма першых заняткаў – «Марк Шагал і Віцебск». Лектарам выступіла краязнаўца, старшыня апякунскага савета музея Марка Шагала ў Віцебску Людміла Хмяльніцкая.

3 кастрычніка прайшла ўрачыстая цырымонія адкрыцця міжнароднага адукацыйнага праекта «Смаленска-Віцебскі трансфер: экалагічныя канцэпцыі гарадоў-пабрацімаў», які рэалізуецца пры падтрымцы Нямецкага культурнага цэнтра імя Гётэ.

5 кастрычніка была праведзена літаратурна-музычная вечарына, прысвечаная Дню пажылых людзей.

12 кастрычніка адбыліся чарговыя заняткі бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада». Тэма: «Напярэдадні вялікіх зрухаў: Віцебск на мяжы XIX–XX стст.». Разам з Людмілай Хмяльніцкай слухачы курсаў ажыццяўлялі вандроўку па плане г. Віцебска 1904 года.

12 кастрычніка прайшла творчая сустрэча з беларускай пісьменніцай Наталляй Батраковай, якая прэзентавала тэматычны зборнік вершаў «Экстрасистолы любви. Монолог женщины».

16 кастрычніка ў рамках бібліятэчнага праекта «Разам!» адбылася творчая сустрэча з мастаком-экспазіцыянерам, дызайнерам, членам Беларускага саюза мастакоў Юрыем Чарняком «Духоўнасць. Маральнасць. Культура».

17 кастрычніка была арганізавана творчая сустрэча з пісьменнікамі Леанідам Дранько-Майсюком і Эдуардам Акуліным. На сустрэчу з паэтамі, якія выступаюць ў бібліятэцы не ўпершыню, прыйшлі прыхільнікі добрай літаратуры, сябры, калегі і чытачы.

19 кастрычніка ў межах адукацыйнага праекта «Смаленска-Віцебскі трансфер: экалагічныя канцэпцыі гарадоў-пабрацімаў» прайшло ўрачыстае адкрыццё фотавыставы «ЭкоМир Смоленского края».

19 кастрычніка адбылася прэзентацыя выставы мініяцюрных кніжных выданняў з прыватнай калекцыі Алега Лабачова (г. Смаленск, Расійская Федэрацыя) «Мастацтва мініяцюрнай кнігі», прысвечаная 500-годдзю беларускага кнігадрукавання і 205-годдзю вайны 1812 года.

19 кастрычніка прайшла прэзентацыя новай кнігі беларускага празаіка, эсэіста, публіцыста Франца Сіўко «Штрыхкоды». Адзінаццатая кніга празаіка, лаўрэата літаратурных прэмій імя Уладзіміра Караткевіча і «Гліняны Вялес», – гэта зборнік эсэ, у які ўвайшлі як друкаваныя раней, так і новыя творы.

23 кастрычніка ў аддзеле літаратуры па мастацтве была праведзена творчая сустрэча «Скарбонка маёй душы» з актрысай, вядучым майстрам сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа, заслужанай артысткай Рэспублікі Беларусь Таццянай Ліхачовай. Удзел у мерапрыемстве прынялі сябры і калегі актрысы, прыхільнікі таленту. Лірычныя, характарныя, трагічныя і камічныя ролі былі прадстаўлены ва ўрыўках спектакляў з удзелам актрысы. Вечар